**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**
**Гістарычны факультэт**
**Кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу**

Гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запрашае прыняць удзел у міжнароднай навуковай канферэнцыі па пытаннях сацыяльнай гісторыі Беларусі **“Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.”.**

**Час правядзення:** 17 лістапада 2023 г.

**Месца правядзення:** Мінск (Рэспубліка Беларусь), Беларускі дзяржаўны універсітэт, гістарычны факультэт (вул. Мендзялеева 36.)

**Рабочыя мовы:** беларуская, руская

**Навуковыя напрамкі работы канферэнцыі:**

• сацыяльныя трансфармацыі беларускага грамадства ў канцы XVIII – пачатку XXI стст.;
• мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.;
• сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.;
• этна-канфесійныя і дэмаграфічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.;
• сучасныя тэндэнцыі і навацыі вывучэння сацыяльнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XXI ст.
• фарміраванне і развіццё школы сацыяльнай гісторыі Беларусі на гістарычным факультэце БДУ

**Для ўдзелу ў канферэнцыі** неабходна **да 12 кастрычніка 2023 г.** даслаць на электронную скрыню арганізацыйнага камітэта (MakareVS@bsu.by) тэкст дакладу і заяўку (у адным файле). Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заявак для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для публікацыі. Праезд, пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляецца за кошт камандзіруючай арганізацыі.

**Патрабаванні да афармлення артыкулаў:** да публікацыі прымаюцца матэрыялы аб'ёмам да 15 тыс. знакаў, набраныя ў MS Word, тэкст з адзінарным інтэрвалам, шрыфт Times New Roman 14 пт. Афармляць спасылкі неабходна ў тэксце ў квадратных дужках. Бібліяграфічныя спасылкі афармляюцца ў канцы тэкста ў алфавітным парадку. Выкарыстанне

аўтаматычных пастаронкавых спасылак не дапускаецца. Бібліяграфічныя спасылкі афармляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь (https://vak.gov.by/bibliographicDescription). Тэкст артыкула павінен таксама ўтрымліваць код універсальнага дзесяцічнага класіфікатара (УДК), анатацыю на трох мовах (беларуская, руская, англійская), ключавая словы на трох мовах (беларуская, руская, англійская). Выданне зборніка артыкулаў запланавана на 2023 год.

**Прыклад афармлення артыкула:**

**УДК 94(438).081:323/070"1924/1939"**

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ**

***Л. А. Канаваленка***

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Kanavalenka@bsdu.by*

Мэтавай аўдыторыя беларускага часопіса “Працаўніцы лясной гаспадаркі і нябачныя” былі жанчыны. Фарміраванне з асноўнымі сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі пераўтварэннямі ў БССР/СССР выступала асноўнай задачай выдання. Часопіс фарміраваў уяўленні пра сітуацыю ў суседніх, капіталістычных, краінах. У часопісе змяшчалася пераважна інфармацыя пра становішча ў ёй нацыянальных меншасцей, эканамічную і сацыяльную палітыку польскіх уладаў, рабочы рух, пераслед актывістаў і інш.

***Ключавыя словы:*** *БССР; “Працаўніцы лясной гаспадаркі”; жаночыя выданні; інфармаванне насельніцтва*

**ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИЕ И СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ПРОЦЕССЫ**

***Л. А. Коноваленко***

*Белорусский государствнный экономический университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Kanavalenka@bsdu.by*

Целевой аудиторией белорусского журнала «Работницы лесной” были женщины. Основной задачей издания являлось знакомство с основными социально-экономическими и общественно-политическими преобразованиями. Вместе с тем, журнал формировал представления о ситуации в соседних,

капиталистических странах. В издании преобладала информация о положении в ней национальных меньшинств, экономической и социальной политике польских властей, рабочем движении, преследованиях активистов и др.
***Ключевые слова:*** *БССР; Польша; «Работница лесной”; Информирование населения; женские издания.*

## POLITICAL AND SOCIO-ECONOMIC DEVELOPMENT

***L. Kanavalenka***

*Belarusian State Economic University, 4, Niezaležnasci avenue, Minsk 220030, Belarus,*
*Kanavalenka@bsdru.by*

Women were the target audience of the Belarusian magazine “Forest Worker. The main task of the periodical was to form their worldview, to present the main socio-economic and political transformations. At the same time, the magazine formed the vision of the capitalist countries development. One of them was the Polish Republic. The information about the position of the national minorities, the economic and social policy of the Polish authorities, the labor movement, the persecution of activists was dominating in the magazine. Most of the articles were based on the contrast of the “good” situation in the BSSR/ USSR and the “bad” in Poland, that indicates the use of manipulative practices in the periodical and the formation of biased conclusions among its readers.
***Keywords:*** *BSSR; “Belaruskaja Forest Worker” propaganda; women's periodicals.*

*[тэкст артыкула]*

Усталяванне савецкай улады ў Беларусі суправаджалася як грамадска-палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі пераменамі, так і фарміраваннем новага светапогляду жыхароў рэспублікі. Адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты быў выпуск перыядычных выданняў, арыентаваных на розныя групы насельніцтва. Сярод іх быў і часопіс “Працаўніца лясной гаспадаркі”, мэтавай аўдыторыяй якога былі жанчыны. Рашэнне аб яго ўзнікненні і распаўсюджанні было прынята ЦК КП(б)Б [1, арк. 91].

У БССР выданне часопіса была даручана жаночаму аддзелу ЦК КП(б)Б. Выхад першага нумара быў прымеркаваны да гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі, правядзення усебеларускага з’езда грамадскіх дзяячак і стварэння дэлегацкіх сходаў [1, арк. 18; 2, арк. 15]. Адбылося гэта ў лістападзе 1924 г. Перыядычнасць выхаду часопіса вагалася ад 1 да 3 нумароў у месяц. Пад уплывам сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у БССР восенню 1931 г. адбылася змена яго назвы на “Работніца”. Часопіс

распаўсюджваўся праз падпіску і свабодны продаж, а яго тыраж вагаўся ад 3 тысяч да 18.500 экзэмпляраў [3, с. 12].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Григорьев Г. Всего шагов (за пограничными столбами) // Беларуская сялянка. 1924. No 3. С. 23.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусі (далей – НАРБ). Ф. 9 п. Воп. 4. Спр. 184.
3. НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 123.
4. Рост тыража // Работніца і калгасніца. 1938. No 20. С. 12–13.
5. Як сяляне Заходняй Беларусі змагаюцца // Работніца. 1928. No 4. С. 9.



**Адрас аргкамітэта:** 220037, г. Мінск, вул. Мендзялеева 36, гістарычны факультэт БДУ, каб. 108. e-mail: MakareVS@bsu.by


**Заяўка на ўдзел у канферэнцыі:**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку/ Фамилия, имя, отчество

2. Вучоная ступень / Учёная степень

3. Вучонае званне / Учёное звание

4. Афіляцыя (назва установы) / Аффилиация (название учреждения)

5. Пасада / Должность

6. Кантактны тэлефон / Контактный телефон

7. адрас электроннай пошты / адрес электронной почты

8. тэма выступлення / тема выступления